МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
7 чэрвеня 1996 г. № 03-18/2024

Упраўленні культуры аблвыканкамаў
і Мінскага гарвыканкама

Накіроўваем для кіраўніцтва Тыпавыя штаты цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Міністэрства культуры, узгодненыя з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь 31.05.96 № 06-6/533, узамен Тыпавых штатаў цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, зацверджаных загадам Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь ад 08.01.96 № 5.

**Першы намеснік Міністра** **У.П.Рылатка**

## ТЫПАВЫЯ ШТАТЫ
## цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

| Назва пасад | Колькасць адзінак | | | | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | група па аплаце працы | | | | |
| | I | II | III | IV | |
| Цэнтральная гарадская, раённая бібліятэка | | | | | |
| Адміністрацыя | | | | | |
| Дырэктар | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Намеснік дырэктара | 2 | 2 | 1 | 1 | |
| Сакратар-машыністка | 1 | 1 | – | – | |
| Аддзел абслугоўвання і інфармацыі (чытальная зала, абанемент, даведачная служба, МБА) | | | | | |
| Загадчык аддзела | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Галоўны бібліятэкар | 1 | 1 | 1 | – | |
| Вядучы бібліятэкар | 2 | – | – | – | |
| Бібліятэкар (пры 2-зменным рэжыме работы) | 4 | 4 | 4 | 4 | |
| Загадчык інфармацыйна-бібліяграфічнага сектара | 1 | 1 | – | – | |
| Галоўны бібліёграф | 1 | 1 | 1 | – | |
| Бібліёграф | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Аддзел камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду | | | | | |
| Загадчык аддзела | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Галоўны бібліятэкар | 1 | 1 | 1 | – | |
| Вядучы бібліятэкар | 1 | – | – | – | |
| Бібліятэкар | 3 | 3 | 2 | 2 | |
| Аддзел бібліятэчнага маркетынгу | | | | | |
| Загадчык аддзела | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Галоўны бібліятэкар | 1 | 1 | 1 | – | |

ЭТАЛОН
*Официальная правовая информация*
*Информационно-поисковая система "ЭТАЛОН", 17.11.2023*
*Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Вядучы бібліятэкар | 1 | – | – | – | |
| Метадыст | 2 | 2 | 1 | 1 | |
| Бібліятэкар | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Мастак-афарміцель | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і гаспадарчага абслугоўвання | | | | | |
| Загадчык аддзела | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Падсобны рабочы | 1 | 1 | 1 | 1 | |
| Вадзіцель | 1 | 1 | 1 | 1 | Пры наяўнасці аўтатранспарту |
| Аператар размнажальнай тэхнікі | 1 | 1 | 1 | 1 | Пры наянасці размнажальна-капіравальных апаратаў |
| Інжынер | 1 | 1 | 1 | 1 | Пры наяўнасці ЭВМ |
| Пераплётчык | 3 | 2 | 1 | 1 | |

Заўвагі:

1. Дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы з'яўляецца адначасова кіраўніком цэнтральнай бібліятэкі.

2. Пасада інспектара па кадрах уводзіцца пры наяўнасці не менш за 80 адзінак па штатнаму раскладу.

3. Колькасць работнікаў аддзела абслугоўвання і інфармацыі ўстаноўлена зыходзячы з нарматываў нагрузкі работнікаў аддзела і наступных паказчыкаў па цэнтральнай бібліятэцы.

| Група па аплаце працы ЦБС | Колькасць чытачоў | Колькасць кнігавыдач (тыс.) |
|---|---|---|
| I | 3850 | 55 |
| II–III | 2450 | 35 |
| IV | 1750 | 25 |

Пры колькасці чытачоў і кнігавыдач звыш азначаных дадаткова ўводзяцца пасады бібліятэчных работнікаў з разліку адна адзінка на кожныя наступныя 700 чытачоў і 10 тыс. кнігавыдач, 0,5 адзінкі – на кожныя наступныя 350 чытачоў і 5 тыс. кнігавыдач.

4. У інфармацыйна-бібліяграфічным сектары цэнтральнай бібліятэкі пры колькасці чытачоў у сістэме звыш 45 тыс. і 800 тыс. кнігавыдач у год апрача адзінак, якія прадугледжаны тыпавымі штатамі, дадаткова ўводзіцца адна адзінка бібліёграфа на кожныя 20 тыс. чытачоў сістэмы.

5. У цэнтральных бібліятэках і бібліятэках-філіялах могуць ствараецца спецыялізаваныя аддзелы (сектары): абслугоўвання вучняў старэйшых, малодшых класаў, мастацтва, нотна-музычныя, юнацкія; абанементы, чытальныя залы або сектары кніг па замежных мовах; фанатэкі і г.д. Аддзелы (сектары) ствараюцца ў межах колькасці адзінак бібліятэчных работнікаў, якія вызначаны ў адпаведнасці з п. 3.

6. У аддзеле камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду цэнтральнай бібліятэкі апрача адзінак, якія прадугледжаны тыпавымі штатамі, дадаткова ўводзяцца штатныя адзінкі бібліятэчных работнікаў: галоўныя бібліятэкары, вядучыя бібліятэкары, бібліятэкары. Пры гэтым агульная колькасць штатных пасад устанаўліваецца з разліку 1 адзінка на 6 тыс. экз. паступленняў і выбыцця бібліятэчнага фонду (кніг, часопісаў, газет, аўдыёвізуальных матэрыялаў). Пасада бібліятэчнага работніка па арганізацыі адзінага фонду і ўнутрысістэмнаму кнігаабмену ўводзіцца на кожныя 300 тыс. экз. бібліятэчнага фонду цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

7. У аддзеле бібліятэчнага маркетынгу апрача адзінак, якія прадугледжаны тыпавымі штатамі, дадаткова ўводзіцца пасада метадыста з разліку адна адзінка на кожныя 15 бібліятэк у раённай ЦБС і 10 бібліятэк у гарадской ЦБС.

8. У гарадскіх і гарпасялковых філіялах агульная колькасць бібліятэчных работнікаў (акрамя загадчыка філіяла) вызначаецца з разліку 1 штатная адзінка на кожныя 700 чытачоў і 10 тыс. кнігавыдач у год, у дзіцячых філіялах – 600 чытачоў і 9 тыс. кнігавыдач у год, у сельскіх філіялах – на кожныя 450 чытачоў і 6 тыс. кнігавыдач у год.

9. У сельскай бібліятэцы-філіяле з колькасцю чытачоў ад 250 да 450 і ад 3,3 да 6 тыс. кнігавыдач уводзіцца адна пасада бібліятэкара.

10. Пасада загадчыка філіяла ўводзіцца пры колькасці чытачоў і кнігавыдач у:

гарадской бібліятэцы-філіяле звыш 2000 чытачоў і 30 тыс. кнігавыдач;

гарадской (раённай) дзіцячай бібліятэцы-філіяле звыш 1600 чытачоў і 27 тыс. кнігавыдач;

гарпасялковай бібліятэцы-філіяле звыш 1400 чытачоў і 21 тыс. кнігавыдач;

гарпасялковай дзіцячай бібліятэцы-філіяле звыш 600 чытачоў і 9 тыс. кнігавыдач;

сельскай бібліятэцы-філіяле звыш 700 чытачоў і 10 тыс. кнігавыдач.

11. Нарматывы нагрузкі па колькасці чытачоў і кнігавыдач для загадчыкаў аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі, камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду, інфармацыйна-бібліяграфічнага сектара, філіялаў устанаўліваюцца ў памеры 50 % ад норм, якія прадугледжаны для бібліятэчных работнікаў адпаведных падраздзяленняў ЦБС. На іншыя кіруючыя пасады ўказаныя нарматывы не распаўсюджваюцца.

12. Для цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм з колькасцю чытачоў звыш 95 тыс. у год і 1520 тыс. кнігавыдач структура і штаты вызначаюцца ў індывідуальным парадку па ўзгадненні з адпаведнымі органамі кіравання.

13. Пасада прыбіральшчыка ўводзіцца з разліку 1 адзінка на кожныя 300 кв. м плошчы, якая падлягае ўборцы. Пры агульнай плошчы ўборкі да 300 кв. м колькасць прыбіральшчыкаў вызначаецца з разліку 0,5 адзінкі на кожныя 150 кв. м, менш за 150 кв. м – уводзіцца 0,25 адзінкі прыбіральшчыка.

Пры наяўнасці пячнога ацяплення ўводзіцца адна адзінка прыбіральшчыка на кожныя 150 кв. м плошчы ўборкі і 0,5 адзінкі пры плошчы ўборкі менш за 150 кв. м.

14. Пасада гардэробшчыка ўстанаўліваецца з разліку 0,5 адзінкі на кожныя 80 нумароў у гардэробе.

15. Пасада дворніка ўводзіцца ў адпаведнасці з нормамі плошчы, якая прыбіраецца. Нормы ўстанаўліваюцца выканкамамі органаў мясцовай улады.

16. Пры наяўнасці абагравальных катлоў на ацяпляльны сезон устанаўліваюцца пасады качагараў з разліку 1 адзінка ў змену. З агульнай колькасці качагараў 1 пасада ўстанаўліваецца на круглы год.

17. Пасады рабочых па абслугоўванні і бягучым рамонце памяшканняў, збудаванняў і абсталявання ўводзяцца з разліку 1 адзінка на кожныя 1500 кв. м плошчы, абсталяванай вадаправодам і каналізацыяй, пры плошчы менш за вызначаную норму – 0,5 адзінкі, адна адзінка на кожныя 350 асвятляльных кропак, а пры наяўнасці электракропак менш за вызначаную норму – 0,5 адзінкі.

18. Зыходзячы з канкрэтных умоў і аб’ёмаў работы ў штаты ўстаноў з дазволу органаў кіравання, якія выдаткоўваюць сродкі на іх утрыманне, могуць быць уведзены іншыя пасады спецыялістаў і рабочых.